*Аляксей Рагуля*

**«ХАЦЕ АБАВЯЗАНЫ»: РЭФЛЕКСІЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ МАДЭЛІ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ У ФІЛАСОФСКАЙ ЛІРЫЦЫ А.КУЛЯШОВА**
***(да 100-годдзя з дня нараджэння)***

Прагматысцкая арыентацыя навукова-тэхнічнага прагрэсу і ёй абумоўленая абсалютызацыя тэхналагічнага дэтэрмінізму ў сучасным гандлёвым соцыуме маюць сваім вынікам занядбанне ў кагніталогіі цікавасці да анталагічнай праблематыкі і перш за ўсё да фундаментальнай катэгорыі ў пазнавальнай дзейнасці – катэгорыі *быцця*. М.Хайдэгер у славутай працы “Быццё і час” (1927), якая стала вынікам філасофскага асэнсавання пережытых і надыходзячых сацыяльных катастрофаў першай паловы XX ст., пісаў: “*На фоне грэчаскіх падыходаў да інтэрпрэтацыі быцця склалася догма, якая не толькі аб’яўляе пытанне аб сэнсе быцця неабавязковым, але нават санкцыянуе непатрэбнасць звароту да гэтага пытання. Гаварэць: “быццё” найбольш агульнае і найбольш пустое паняцце. Як гэткае, яно не мае патрэбы ні ў якой дэфініцыі* ” [3, 2].

Пагроза нігілісцкага адмаўлення сэнсу ў суадносінах такіх катэгорыяў, як *быццё*, *існасць* і *сутнасць*, заканамерна падводзіць і да адмаўлення сэнсу ў *прысутнасці* чалавека ў агульнай карціне жыццядзеяння, яго існавання ў формах канкрэтна-фенаменалагічных модусаў. Нігілізм падобнага ўзору можна выкарыстаць для апраўдання любых сродкаў раптоўнага авалодання вугляроднымі ці людскімі рэсурсамі планеты, каб потым з выгодамі рэгуляваць колькасць іх наяўнай патрэбы ў залежнасці ад тымчасовых інтарэсаў бюракратычна-фінансавай алігархіі. Новыя ліквідатарскія тэхналогіі не маюць патрэбы ў прымітыўных формах улады: мяча ці аўтамата Калашнікава, існуюць дэталёва распрацаваныя спосабы інтэлектуальна-этнічнага суіцыду. І найбольш цывілізаваны з іх – гэта механізмы элімінацыі з карціны быцця якасных крытэрыяў яго ацэнкі, разбурэння культурнай памяці, выключэнне са сфераў навуковай і педагагічнай дзейнасці семантычна насычанай прыроднай мовы, замена яе штучным бульварна-канцылярскім жаргонам. У выніку з карціны быцця выпадае актуальны час і разам з ім – звяно памяці пра гісторыю самарэалізаваных і страчаных пакаленняў этнасу. Быццё ў такой сітуацыі нагадвае бяздумнае гушканне на расхістаных д’ябальскіх арэлях.

М.Хайдэгер у сваім філасофскім пошуку адштурхоўваўся ад цвёрдага грунту лакальнай народнай культуры верхняй Швабіі, сацыяльнага вопыту мястэчкаМескірхэ, дзе ён нарадзіўся ў сям’і рамесніка і дзе прайшлі гады маленства і юнацтва. Менавіта ў гэтым кутку паўднёва-заходняга рэгіёна Германіі і сфарміравалася ў цікаўнага юнака прага пошуку надзейнай і пэўнай, сутнаснай асновы быцця. Тут закладваўся грунт базавага, ключавога канцэпта яго фенаменалогіі – Dasein, *тут-быццё* як альтэрнатыва вар’яцкім планам у расхістанай псіхіцы палітычных авантурыстаў і іх інтэлектуальнай абслугі. Своеасаблівымі мадыфікацыямі ключавога Хайдэгеравага канцэпта з’яўляюцца фенаменалагічныя вербальныя сімвалы *прасёлак і паляна* – альтэрнатыва той сацыяльнай практыцы, якая азначана канцэптамі і рэферэнтамі *наша непрасветленасць, забытасць, пасрэднасць, заклапочанасць, лабірынтнасць.* Карціна быцця з невыразнымі яго контурамі ў абывацельскім грамадстве адкрывае прастор для гульняў злой волі. У фенаменалогіі М.Хайдэгера яна ўвасоблена ў феномене *праўдырства, фюрэрства,* сутнасць якога ёсць перманентныя крывавыя разборкі глабальнага маштабу, вайна за ўладу над людскімі і вугляроднымі рэсурсамі.

М.Хайдэгер недаверліва паставіўся да перспектывы далейшага руху па магістральных шляхах сучаснай цывілізацыі. Гэты рух прывёў у эпоху, вызваленую ад нормаў ачалавечанага быцця. Выйсце філосаф шукае на шляхах актуалізацыі сэнсаў, закладзеных у класічнай філасофіі Антычнасці, эстафету якой, на яго думку, змагла ў Еўропе прадоўжыць нямецкая класічная філасофія XVIII і XIX стагоддзяў. Застаючыся на пазіцыях заходнееўропацэнтрызму, М.Хайдэгер не звярнуў належнай увагі на фарміраванне кагнітыўнай прасторы ў нетрах пазаафіцыйнага жыцця на абсягах Цэнтральнаеўрапейскага культурнага рэгіёна. У гістарычным самасцвярджэнні чэшскага, напрыклад, этнасу адыграла важную ролю арыентацыя на прынцып *прыродазгоднасці*. Польская грамадская думка гартавалася на грунце мужнага даследавання *катастрафізму* новай эпохі, беручы за арыенцір прынцыпы нацыянальнай *годнасці і народнасці*. Ва ўкраінскай і беларускай культурах прыярытэтнай стала ідэя чалавечай *роднасці*. А.Маджэўскі-Фрыг, Я.А.Каменскі, Г.Скаварада, Ф.Скарына – філосафы, якія закладвалі асновы метафізікі на ўзроўні анталагічнай праблемы, ацэньваючы не толькі працу розуму, але і душы. Сваё вербальнае афармленне гэты рух атрымаў у працы Яна Паточкі “Еўропа і пост-Еўропа. Постеўрапейская эпоха і яе духоўныя праблемы” (1977).

Абагульняючы аналітычны вопыт Э.Гусэрля і М.Хайдэгера, Я.Патачка прыходзіць да вываду, што ў еўрапейскім свеце існуюць дзве арыентацыі, два віды метафізікі: “Калі метафізіка аднаго віду дапамагала ствараць яго маральныя ідэалы і вялікі універсальныя інстытуцыі, то метафізіка другога віду прыдала яму сілы прыроды і разам з імі сродкі для кароткачасовага панавання над светам” [2, 18].

Для культуры Цэнтральнаеўрапейскага рэгіёна больш характэрнай з’яўляецца метафізіка першага віду. Яе можна назваць метафізікай душы. Схільныя да рэфлексіі быцця тыпы Задумнага і Цікаўнага ўжо выразна акрэслены ў беларускай міфалогіі і казачным эпасе. У новым часе фенаменалагічныя персанажы явы, наўя, ладу перайшлі ў разрад абстрагаваных вербальных універсаліяў. Семантыка катэгорый *хараство,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*людскасць, дыхтоўнасць, вязьмо* ўжо сведчыць пра наяўнасць у беларускай маўленчай культуры развітой канцэпталогіі, сістэма якой скіравана на выкрыццё часткоўага пустотнага квазівыказвання, былі супрацьпастаўлены баналізацыі ў маўленчай дзейнасці. У жывой народнай мове паспяхова дзейнічалі разнастайныя жанравыя формы: прамова, казанне, гутарка, былічка, гавэнда, показка, скарга, дэкламацыя, блазона. Пры гэтым актыўна дзейнічаюць як жанравыя так і антыжанравыя формы. Застаючыся ў формах традыцыйнай каардынацыі і субардынацыі элементаў, жанравая сістэма не спынілася на стадыі фармальнай адаптацыі да ўмоў гандлёвага соцыуму. Сацыялагізацыя традыцыйнага хранатопу XVIII – XIX стст. суправаджалася акамадацыяй у сферы псіхагенезу, што прывяло да ўзбуйнення аб’ектаў аналізу. На гэтым напрамку ўзнік беларускі Dasein – канцэпцыя *тутасці*. У якасці альтэрнатывы маргінальнай тутэйшасці былі створаны такія мастацкія феномены як *мужыцкая праўда, родны кут* і *Сам-сітуацыя*. Такім чынам, беларускі вусны фальклор к XX стагоддзю дасягнуў у сваім развіцці ў пазнавальнай дзейнасці ўзроўню генералізацыі, равўнавялікага еўрапейскаму фенаменалагічнаму руху, філасофіі жыцця. Зразумела, што аб’ектам рэфлексіі ў фальклоры была не навуковая, хвалева-карпускулярная, а пачуццёвая карціна свету. Фальклорныя формы філасофскай медытацыі тым не менш адыгралі вялікую ролю ў арганізацыі кагнітыўнага працэсу ўжо на ўзроўні індывідуальнай аўтарскай творчасці. Медытатыўная лірыка У.Жылкі, П.Труса, А.Моркаўкі, С.Дзяргая і асабліва М.Танка і А.Куляшова сёння ўспрымаецца як новы этап у развіцці фальклорнай фенаменалогіі нацыянальнага духу, яго супрацьстаянне і адказу на выклік лагістычнага гіпастазіравання карціны быцця ў метафізіцы “другога віду”, якая на практыцы становіцца апалогіяй макіявілізму, фрэйдызму, ніцшэанства, гітлерызму і сталінізму. Крыніцай рэсурсаў у супрацьстаянні метафізіцы зла, у фальклоры з’яўляецца семантыка лакальнай культурнай прасторы – гаспадарча-культурны ландшафт, у цэнтры якога стаіць хата. Менавіта тут сыходзяцца і перасякаюцца дацэнтрабежныя і адцэнтрабежныя лініі сэнсаў касмічнага і лакальнага быцця, тут выяўляецца і выартасць і жыццёвасць духоўных і сацыяльных ідэалаў, тут яны з’яўляюцца на свет, атрымліваюць гарт і сілу. Семантыка хаты (дому) ў беларускай народнай культуры мае вельмі багатую гісторыю, адлюстраваную ў сімволіцы роднага гнязда (у тым ліку і раскіданага), дзяржавы-дома – як альтэрнатывы дзяржаве-казарме і пабудаванаму на чалавечых касцях і чарапах палацу.

Эманацыя духоўнасці ў касмічную прастору таксама пачынаецца з сялянскай хаты. беларуская паэталогія, як бачым, робіць вельмі істотную карэкцыю ў рэфлексіі еўрапейскай трансцэндэнтальнай тэлеалогіі:

Я хаце абавязаны прапіскаю –
Калыскаю, падвешанай пад столь.
Я маці абавязан кожнай рыскаю,
Драўлянай лыжкаю, глінянай міскаю –

Я – матчын спеў, я – матчыны трывогі,
Я – матчын гнеў, які ўставаў на ногі,
Гнаў смерць на Захад – у нару з нары –
Трацілаваю пугай перамогі.
Дыміліся сямі франтоў дарогі
За мной, як дынамітныя шнуры.

Пазбавіўшы ад грознага відовішча
Свет, не дазволю я, каб дым і пыл
Зямлюператварылі ў бамбасховішча,
Мільярд прапісак – у маўклівы прысак,
Мільярд калысак – у мільярд магіл.[1, с.390]

Варта зазначыць яшчэ, што паэтычная рэфлексія мае выразна акрэсленую мэту – рэвіталізацыю расшчэпленай свядомасці, адраджэнне эпічнага стылю жыццядзеяння нацыянальнага духу:

Палае горан мой у соснах,
Куецца ў ім дарожны дух
Для шлоных круч, для хваль высозных,
Для самых грозных завірух. [1, с.312]

**Спіс літаратуры:**


1. Куляшоў, А. Збор твораў : у 5 т. / А. Куляшоў. – Мінск : Маст. літ. 1974. – Т. 1: Вершы. – 52 с.
2. Паточка, Я. Европа и пост-Европа. Пост-европейская эпоха и её духовные проблемы / Ян Паточка. – Минск : Изд. дом И. П. Логвинов, 2011. – 204 с.
3. Хайдеггер, М. Бытие и время / М. Хайдеггер. – М., 2013. – 450 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ